**Урок 6. Пісьмо элементаў літар: гарызантальныя лініі з закругленнем**

***Мэта:*** забяспечыць знаёмства вучняў з элементамі літар, іх назвамі (лінія з закругленнем), асваенне спосабу напісання новых элементаў літар — гарызантальных ліній з закругленнем з аднаго і двух бакоў, замацаванне асноўных гігіенічных правіл пісьма (пасадка, сшытак, ручка); развіццё агульнавучэбных уменняў і навыкаў (карыстацца пісьмовымі прыладамі, ажыццяўляць кантроль і самаацэнку вынікаў дзейнасці); выхаванне акуратнасці падчас пісьма.

***Абсталяванне:*** Пропісь 1, с. 13, вокладка 2 (форзац); калька; плакаты «Сядзі правільна пры пісьме», «Трымай ручку правільна» (ВНД «Уводзіны ў школьнае жыццё»); дэманстрацыйны набор элементаў літар.

**1. Этап падрыхтоўкі да засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў. *Актуалізацыя апорных ведаў.*** Паўтарэнне асноўных правіл пісьма.

***Паведамленне тэмы, пастаноўка мэты ўрока.***

На ўроку вучні працягнуць знаёмства з элементамі літар, ставіць мэту: навучыцца пісаць новыя элементы — лініі з закругленнем.

**2. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў. *Знаёмства з новым элементам літар.***

Пропісь, с. 13 — рамка з узорам элементаў літар «гарызантальныя лініі з закругленнем з аднаго і двух бакоў».

Абвядзіце па пункціры павялічаны ўзор элементаў у рамцы.

***Падрыхтоўка рукі да пісьма.***

Мы жывём сям'ёй цікавай,
Кожны за сваёю справай:
Гэты братка дом вартуе,
Той — вячэру ўсім гатуе,

А як гэты з'есць яе,
Той нам песенькі пяе.
Я ж з гары на ўсіх гляджу,
«Малайцы, браты!» — кажу

***Развіццё маторыкі рукі: малюнак з элементамі літар.***

*Абвядзенне па контуры малюнка «Слон на арэне цырка».*

*Загадкаблытанка.*

Ногі тоўстыя — нямала!
Вуха — быццам бы махала,
Сам ён важыць пару тон.
Можа, гэта царскі трон? *(Гэта слон!)*

Правядзіце гарызантальныя лініі з закругленнем з аднаго і двух бакоў.

***Навучанне пісьму элемента літар.***

*<u>Прагляд інтэрактыўнай дэманстрацыі напісання элементаў літар «гарызантальныя лініі з закругленнем з аднаго і двух бакоў» пры дапамозе QR-кода (вокладка).</u>*:

— Лінію з адным закругленнем злева пачынаем пісаць ніжэй сярэдзіны нерабочага радка. Злева направа робім закругленне да сярэдзіны нерабочага радка і вядзём прамую лінію ўправа (уздоўж дадатковай лініі).

— Лінію з закругленнем з двух бакоў пачынаем пісаць ніжэй сярэдзіны нерабочага радка. Злева направа робім закругленне да сярэдзіны нерабочага радка і вядзём прамую лінію ўправа (уздоўж дадатковай лініі). Робім закругленне ўніз і ўлева. Каментарый да наступных радкоў даецца па аналогіі з папярэднімі.

***Замацаванне. Прымяненне асвоеных спосабаў дзеянняў.***

Дапішыце літары на апошніх радках.

**3. Рэфлексіўны аналіз вучнямі вынікаў вучэбнай дзейнасці. Падвядзенне вынікаў урока.**

Раскажыце, які элемент літар вы навучыліся пісаць на ўроку, хорам паўтарыце яго назву: «лінія з закругленнем».